**Польшча была адной з першых краін ЕС, якія ўвялі абмежаванні ў сувязі з каранавірусам, і яна зрабіла гэта ў рамках Вышаградскай чацвёркі, не чакаючы агульнай пазіцыі Еўропы. Вы прадчувалі, што такая пазіцыя не з'явіцца, альбо Вы хацелі ўмацавання групы адносна Бруселя?**

З самага пачатку нашай мэтай было забеспячэнне бяспекі ўсіх грамадзян. Мы кіраваліся клопатам пра іх дабрабыт, а не нейкім палітычным разлікам. Мы ведалі, што каранавірус з'яўляецца пагрозай для здароўя і жыцця. У такой сітуацыі мы не маглі чакаць. Кожная наступная гадзіна спазнення была звязана з ростам рызыкі. Таму мы дзейнічалі адразу. Хоць гэта было няпростае рашэнне, зараз мы ўпэўнены, што выбралі правільную стратэгію барацьбы з пандэміяй.

**Ці ўведзеныя ў Польшчы і яе партнёраў на ўсходзе Еўропы рашэнні прынеслі спадзяваныя вынікі? Якая сёння сітуацыя ў Вашай краіне?**

Я рады, што развіццё эпідэміі ў многіх краінах Цэнтральнай Еўропы адбываецца больш спакойна. Што датычыцца Польшчы, увядзенне маштабных абмежаванняў было больш сур'ёзным выклікам. У мінулую сераду колькасць пацверджаных выпадкаў перавысіла ў нас 7,5 тыс. Калі б мы не ўвялі такія абмежаванні, сёння нам прыйшлося б мець справу з 30–60 тыс. заражэнняў. Так мяркуюць спецыялісты. Значнае змяншэнне колькасці захворванняў – гэта вынік апаведных рашэнняў, але таксама эфектыўнай дзейнасці нашых служб, у тым ліку адважных і незаменных медыцынскіх служб і паліцыі. Гэта таксама вынік дысцыпліны, якую польскае грамадства стойка пераносіць. Тым больш, што многія палякі маюць поўнае права адчуваць стомленасць праз гэты "грамадскі каранцін". Аднак без яго, без адпаведных мер бяспекі, без разважлівасці – мы маглі б апынуцца ў эпіцэнтры бескантрольнай эпідэміі.

**Польшча не належыць да зоны еўра, таму яе не датычыць дыскусія наконт еўрааблігацый. Як Вы ацэньваеце гэта пытанне з боку? Калі б Вам прыйшлося выбіраць, якую пазіцыю Вы б занялі: тую, якой прытрымліваюцца Іспанія, Францыя і Італія, альбо тую, якую выбралі Нідэрланды і Германія, якія выступаюць супраць абагульнення доўгу?**

Упершыню гэтыя ўнутраныя супярэчнасці зоны еўра праявіліся падчас даўгавога крызісу. Сёння стала відавочна, што праблема не была вырашана. Вельмі шкада, што новы крызіс ізноў закрануў поўдзень Еўропы ў найбольшай ступені. Пры гэтым выбар, які Вы агучылі ў пытанні, ставіць мяне ў нязручную сітуацыю. Я разумею, што гэта рашэнне з'яўляецца ўнутранай справай зоны еўра. Таму я не буду выказваць катэгарычных меркаванняў. Адно я ведаю дакладна. Гэта праблема павінна быць вырашана. Сітуацыя, калі даходы агульныя, а нават адны атрымліваюць ад агульнага рынка больш за іншых, а вось страты кожны нясе паасобку, з'яўляецца няправільнай з палітычнага пункту гледжання і пагражае сёння зоне еўра, а ў выніку ўсяму Еўрапейскаму саюзу.

**Ці дыскусія наконт еўрааблігацый узмацняе перакананне Польшчы не ўступаць у зону еўра, нягледзячы на выкананне ўсіх ўмоў? Які ўплыў на ўзрост ВУП Польшчы будзе мець крызіс, звязаны з пандэміяй каранавіруса?**

Польская эканоміка адчуе гэты крызіс, як і іншыя эканомікі нашага рэгіёна. Сёння нельга прадказаць нават найбліжэйшую будучыню, таму цяжка прывесці

канкрэтныя паказчыкі. Вядома, што гэта будзе беспрэцэндэнтны крызіс; магчыма, ён прынясе найбольшыя эканамічныя складанасці з часоў Другой сусветнай вайны. Перад абліччам маштабнай няўпэўненасці мы імкнёмся праводзіць у Польшчы стабільную фіскальную палітыку. Хачу таксама падкрэсліць, што ў перыяд фінансавага крызісу і даўгавога крызісу, які прыйшоў следам, наша нацыянальная валюта вельмі нам дапамагла. Цяпер мы таксама карыстаемся гэтай перавагай. Еўра – гэта вельмі моцная валюта, але відавочна, што яе раздзіраюць супярэчнасці. Я вельмі хацеў бы, каб зона еўра была максімальна моцнай для дабрабыту ўсёй Еўропы і ў інтарэсах Польшчы, для якой яна з'яўляецца галоўным гандлёвым і палітычным партнёрам.

**Вы разлічваеце на дапамогу з боку ЕС альбо Польшча сама справіцца з праблемамі, якія ўжо пачынаюць з'яўляцца ў сувязі са спыненнем эканамічнай актыўнасці?**

З самага пачатку мы заклікаем, каб адказ членаў ЕС на крызіс быў амбіцыйны. Апошняе рашэнне міністраў фінансаў – гэта крок у правільным напрамку. Урэшце рэшт гаворка ідзе пра маштаб дапамогі, якая пачынае адпавядаць патрэбам Еўропы. Акрамя таго, патрэбны сур'ёзны пакет эканамічнага аднаўлення (recovery plan) і максімальна хуткае пагадненне наконт Шматгадовага фінансавага плана, які таксама павінен адпавядаць патрэбам гэтага крызісу. Гэта датычыцца, у першую чаргу, павелічэння фінансавання палітыкі адзінства, якое ў барацьбе з крызісам ужо зараз адыгрывае ключавую ролю. Усе гэтыя інструменты павінны быць дастаткова гібкімі, каб адпавядаць дзяржавам-членам ЕС. Мы будзем імкнуцца да таго, каб усе дзяржавы мелі да іх аднолькавы доступ. Трэба таксама прама сказаць, што ЕС можа сабе дазволіць маштабны бюджэт, аднак ён нарэшце павінен рэальна змагацца з падатковым раем, пазбяганнем падаткаабкладання, выманьваннем падаткаў, мафіямі махляроў з ПДВ і CIT – усімі тымі механізмамі, якія вельмі элегантна і не менш ілжыва называюць „падатковай аптымізацыяй". Ніякая гэта не аптымізацыя, а звычайны абход заканадаўства альбо нават махлярства – мы штогод страчваем на гэтым дзясяткі мільярдаў еўра, якія насамрэч адбіраюцца ва ўсіх грамадзян ЕС. Час з гэтым скончыць і вярнуць гэтыя грошы ў еўрапейскі бюджэт і бюджэт краін-членаў ЕС. Польшча і Іспанія павінны паглыбіць супрацоўніцтва па гэтым пытанні.

**Адным з асноўных прынцыпаў ЕС з'яўляецца салідарнасць. Яе не хапіла падчас міграцыйнага крызісу і не хапае зараз у справе еўраабліГацый. Мы з'яўляемся сведкамі канца ЕС?**

Я далёкі ад прадказання канца ЕС. Канечне, нам кідаюцца ў вочы ўсе праблемы – партыкулярызм і пэўная запаволенасць дзеянняў. Аднак праз гэта мы разумеем таксама, наколькі каштоўным можа быць Саюз, які дзейнічае эфектыўна і салідарна. Мяркую, што цяперашні крызіс і недахопы, якія можна заўважыць у функцыянаванні ЕС, павінны быць для нас хутчэй імпульсам для направы, рэформы.

Еўрапейскі саюз распачынае працу павольна, можа, нават занадта павольна, але гэта вялізны эканамічны абшар, і мы павінны гэтыя перавагі, гэту моц выкарыстаць дзеля дабрабыту ўсяго Саюза.

**Каранавірус уплывае таксама на палітычную актыўнасць. Ад ЗША да Францыі былі адменены сходы палітычных партый і выбары. Аднак Ваш урад, нягледзячы на пратэсты апазіцыі, вырашыў не пераносіць дату 10**

**мая, прадугледжаную ў выбарчым календары. Акрамя таго, вы плануеце правесці галасаванне па пошце. Чаму для вас так важна захаваць гэту дату?**

Мы павінны высветліць адну рэч, таму што, здаецца, не ўсім гэта інфармацыя вядома: у польскім заканадаўстве няма магчымасці свабоднага пераносу выбараў. Правесці іх у маі – гэта абавязак, які на ўрад накладвае закон. Адзіная сітуацыя, у якой выбары могуць быць перанесены – гэта ўвядзенне надзвычайнага становішча. Але згодна з нашай Канстытуцыяй перанос выбараў – гэта вынік, а не прычына! Нельга выкарыстоўваць надзвычайнае становішча як інструмент толькі для таго, каб перанесці выбары – надзвычайнае становішча звязана з вельмі сур'ёзным абмежаваннем грамадзянскіх праў. Таму заклікаю нашых крытыкаў спачатку пазнаёміцца са зместам польскай Канстытуцыі.

Выбары – гэта аснова дэмакратыі, а выбары па пошце адбываюцца ва ўсім свеце. У тым ліку ў краінах, якія Вы маеце на ўвазе: у некаторых штатах ЗША (Вісконсін) альбо ў Карэі яны па-ранейшаму праводзяцца ў традыцыйным фармаце. У іншых дзяржавах – выключна па пошце. Я не чуў, каб за гэта крытыкавалі Швейцарыю альбо Германію, хоць у апошняй змены ў выбарчае заканадаўства былі прыняты за 4 дні да галасавання. Мы ў Польшчы робім гэта загаддзя. Перш за ўсё, мы хочам мінімізаваць пагрозу інфіцыравання і таму вырашылі правесці выбары па пошце. Такі фармат гарантуе выкананне ўсіх параметраў дэмакратычнага галасавання, а працэдуры, якія ўводзяцца, забяспечаць іх сумленнае правядзенне і поўную таямніцу галасавання. Праект зараз знаходзіцца ў Сенаце, дзе перавагу мае апазіцыя. Мы адкрытыя для іх прапаноў, хочам вырашыць магчымыя непаразуменні. Тут я разлічваю на канструктыўную дыскусію з усімі палітычнымі коламі Польшчы.

**Той факт, што кандыдат урада – цяперашні прэзідэнт лідзіруе ў апытаннях, мае ўплыў на гэта рашэнне? Усведамленне таго, што прэзідэнт Дуда можа выйграць менавіта цяпер, а праз некалькі месяцаў, магчыма, ужо не?**

У мяне такое ўражанне, што гэта хутчэй апазіцыя кіруецца апытаннямі. Іх кандыдаты паказваюць сябе вельмі слаба; я перакананы, што калі б было інакш, то яны не толькі не чакалі б пераносу выбараў, але і самі дабіваліся б іх правядзення. Мы не кіруемся апытаннямі, наша рашэнне абапіраецца выключна на палажэнні Канстытуцыі. Прававая дзяржава – гэта дзяржава, у якой органы ўлады дзейнічаюць згодна з заканадаўствам і ў яго рамках. Тым больш, што складана ацаніць, у які тэрмін увогуле магчыма правядзенне выбараў у такіх умовах, якія былі да эпідэміі. Увесь час невядома, калі будзе вынайдзена вакцына. Таму мы прапанавалі апазіцыі пагадненне па-за палітычнымі падзеламі і перанос выбараў шляхам унясення змен у Канстытуцыю, але без увядзення надзвычайнага становішча і абмежавання грамадзянскіх праў. Для змены Канстытуцыі павінны згадзіцца ўсе палітычныя сілы, на жаль, гэту прапанову апазіцыя адхіліла.

**Улічваючы абмежаванні, звязаныя з пандэміяй, выбарчая кампанія будзе немагчыма, не будуць праводзіцца сустрэчы з выбаршчыкамі. Вам не здаецца, што гэта дае перавагу прэзідэнту Дудзе? Калі ён перастане выкарыстоўваць сваё становішча і абмяжуе выступленні да часу, прадугледжанага Дзяржаўнай выбарчай камісіяй для ўсіх кандыдатаў?**

Адсутнасць сустрэч найбольш шкодзіць якраз прэзідэнту Дудзе – ён заўсёды збіраў натоўпы людзей, ён выдатна сябе адчувае ў непасрэдных зносінах. Абмежаванні аднолькавыя для ўсіх. Заўважце, што іншыя кандыдаты таксама займаюць дзяржаўныя пасады: Малгажата Кідава-Блонская – віцэ-спікер Сейма, Уладзіслаў Касіняк-Камыш – кіраўнік аб'яднання, прадстаўленага ў парламенце, а Роберт Бедрань – дэпутат Еўрапарламента. Яны вельмі актыўныя ў СМІ, у мяне такое ўражанне, што яны з'яўляюцца там часцей, чым цяперашні прэзідэнт. Выбарчая кампанія – гэта не толькі сустрэчы з выбаршчыкамі. Зрэшты, сучасныя тэхналогіі забяспечваюць аднолькавы доступ да выбаршчыкаў. Канечне, прэзідэнт Дуда ў сувязі з пасадай, якую ён займае, прыцягвае ўвагу і зацікаўленасць палякаў. Але меркаванне, што ён павінен спыніць выкананне сваіх абавязкаў, – гэта абсурд. Менавіта цяпер не толькі палякам, але і ўсім грамадзянам Еўрапейскага саюза патрэбны актыўныя лідары, якія правядуць нас праз гэты крызіс. Кожны кандыдат – віцэ-спікер альбо лідар палітычнай партыі – адыгрывае важную ролю ў палітыцы. У кантэксце выбараў гэта забяспечвае канкурэнтнасць, а на фронце барацьбы з каранавірусам дае надзею на змаганне па-за партыйнымі падзеламі.

**ЕС усё яшчэ не выказаўся па гэтым пытанні, як Вы думаеце, ён зробіць гэта?**

Саюзныя пагадненні не навязваюць таго ці іншага спосабу правядзення выбараў. Гэта пытанні, якія ляжаць выключна ў кампетэнцыі краін-членаў ЕС. Выбары павінны быць свабоднымі, усеагульнымі, гарантаваць тайнае галасаванне. Гэта для нас прыярытэтныя моманты. Не бачу прычын, па якіх выбары па пошце ў Германіі былі прызнаныя, а ў Польшчы павінны выклікаць сумненні. Я чакаю прымянення такіх жа прынцыпаў у адносінах да ўсіх краін-членаў ЕС.

**Калі гаворка ідзе пра ЕС... У Польшчы ўсё яшчэ ёсць некалькі нявырашаных канфліктаў, адным з найбольш вострых з'яўляецца спрэчка наконт рэформы судовай сістэмы. Як доўга будуць працягвацца непаразуменні паміж Варшавай і Бруселем?**

Пры розных поглядах мы прытрымліваемся пазіцыі, што арганізацыя судовай сістэмы – гэта незалежнае рашэнне краін-членаў ЕС. Польшча не робіць нічога іншага, а толькі арганізуе – згодна са сваёй Канстытуцыяй – сістэму юстыцыі, каб яна была справядлівай, транспарэнтнай і эфектыўнай. Тут таксама належыць спадзявацца аднолькавых адносін да краін-членаў ЕС. Нельга пагадзіцца з тым, каб у адных дзяржавах прымаўся выбар органаў, якія стаяць на стражы незалежнасці суддзяў, парламентам, а ў Польшчы гэта прызнавалася парушэннем прынцыпаў ЕС. Нацыянальны судовы савет у Польшчы выбіраецца падобным чынам, як іспанскі Генеральны савет судовай улады – парламентам большасцю 3/5 галасоў. У Германіі ўвогуле няма такога савета, а суддзяў прызначаюць непасрэдна палітыкі. Няма ідэальнай сістэмы, але мы лічым, што калі ў Германіі і Іспаніі можа існаваць раўнавага паміж судовай і выканаўчай уладамі, Польшча таксама мае на гэта права, асабліва ўлічваючы, што наша судовая сістэма пасля перыяду камунізму не рэфармавалася.

Рэформа неабходна, таму што раней судовая сістэма не была здольная да самаачышчэння, а колькасць недапушчальных альбо нават ганебных учынкаў і прысудаў расла з кожным годам. Гэта вынікала з таго факта, што суддзі вельмі

часта кіраваліся салідарнасцю ў адносінах да калег, якую яны няправільна разумелі, – і не было сапраўднай дысцыплінарнай адказнасці. Мы гэта змянілі. Мы стварылі Дысцыплінарную палату, якая складаецца з суддзяў, былых адвакатаў, прадстаўнікоў іншых юрыдычных прафесій. Палата поўнасцю незалежная – як ад урада і прэзідэнта (таму што суддзі прызначаюцца пажыццёва), так і ад іншых суддзяў. Раней такой незалежнасці ад уплыву знутры вельмі часта не хапала. Незалежнасць не азначае адсутнасці адказнасці.

**Пасля выхаду Вялікабрытаніі і перад абліччам непаразуменняў паміж Германіяй і Францыяй ЕС патрэбны новы рухавік. Дзе яго трэба шукаць? На поўдні альбо на ўсходзе?**

Цяперашняя сітуацыя генерыруе дынамічныя змены, якія складана прадугледзець, у тым ліку ў галіне геапалітыкі. З’яўляюцца новыя гульцы, якія хацелі б заняць ключавыя пазіцыі на палітычнай сцэне, а таксама ўмацаваць свае рэгіянальныя пазіцыі. Я тут, перш за ўсё, маю на ўвазе Кітай, эканоміка якога ўсё больш уплывае на сусветныя ланцужкі паставак, а таксама Расію, якая традыцыйна выкарыстоўвае розныя крызісы для распаўсюджання дэзынфармацыі і павелічэння хаосу. Таму так важна рабіць стаўку на правераных партнёраў і будаваць нашу бяспеку – ваенную, эканамічную, санітарную, тэхналагічную – на стабільных трансатлантычных адносінах. Яны бываюць складанымі, часта здараюцца непаразуменні, але стратэгічнае адзінства Еўропы і ЗША – перш за ўсё, адзінства каштоўнасцей, якія нас аб’ядноўваюць, – заўсёды павінна быць на першым месцы. Мяркую, што нашы знешнія непаразуменні ў пэўнай ступені з’яўляюцца сутнасцю ЕС, а насамрэч не столькі непаразуменні, колькі ўменне іх пераадольваць. Мы павінны пра гэта памятаць, асабліва перад абліччам такіх эпахальных выклікаў, як сітуацыя ў свеце ў перыяд каранавіруса. Вызначэнне зверху канкрэтных напрамкаў можа быць падманлівым. Гісторыя паказвае, што ў такіх умовах лідар можа з’явіцца нечакана. Супрацоўнічаць у такой ролі павінны не толькі Германія і Францыя, але і ўвесь ЕС, а асабліва 5 найвялікшых краін-членаў ЕС, г.зн. таксама Іспанія, Італія і Польшча.

**Германія, суседка Польшчы, была і надалей з’яўляецца найвялікшай прыхільніцай пашырэння ЕС на Усход. Як вы думаеце, ЕС выйграў бы ад прыняцця новых членаў? Польшча адчувала бы сябе больш бяспечнай, адмяжоўваючыся ад Расіі?**

Зараз барацьба вядзецца, перш за ўсё, за пашырэнне ЕС за кошт Заходніх Балкан і далучэнне да саюза гэтых краін. Я б сказаў, што ў апошні час менавіта краіны нашага рэгіёна, у тым ліку Польшча, з'яўляюцца найбольшымі прыхільнікамі пашырэння ЕС. ЕС не можа ад гэтага адмовіцца, гэта сур'ёзна падарвала б нашу верагоднасць як еўрапейскай супольнасці. Зрэшты, калі глядзець аб'ектыўна, з геапалітычнага пункту гледжання, калі Еўропа не будзе актыўнай на Балканах, калі не будзе падтрымліваць Балканы, то на наша месца прыйдуць іншыя сілы, інтарэсы якіх не абавязкова павінны супадаць з інтарэсамі Еўропы. Ужо сёння выразна відаць актыўнасць у гэтым напрамку Кітая і Расіі, а таксама розных груп, звязаных з радыкальным ісламам. Еўропа не можа пакінуць Балканы на волю лёсу. Гэта датычыцца таксама краін-удзельніц Усходняга партнёрства. Польшча – галоўны адвакат усё больш цеснага супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Украіна і Беларусь – без рэальных прапаноў для гэтых краін мы рызыкуем тым, што яны выберуць арыентацыю на

Расію. Жазэп Барэль, высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі, трапна гэта акрэсліў, сказаўшы, што калі Еўропа мае амбіцыі, каб быць глабальнай сілай, то яна павінна ўмець вырашаць праблемы непасрэдна па суседстве.

**Калі мы ўбачым Вас у Іспаніі? Ці вызначаны ўжо тэрмін чарговага міжнароднага саміту?**

Спадзяюся, што як мага хутчэй. Раней я вельмі часта бываў у Іспаніі, я захапляюся вашай прыгожай краінай. Польшча і Іспанія павінны адыграць надзвычай важную ролю. Я мяркую, што ва ўсёй Еўропе ўжо спраўляюцца з эпідэміяй, і мы зможам паступова планаваць рабочы графік, як раней.